# МАКСІМ БАГДАНОВІЧ – КРЫТЫК БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ

**А.М. Аўчарэнка**

Развіццё літаратурнага руху пачатку XX ст. патрабавала не толькі з'яўлення яркіх постацяў у паэзіі і прозе, але і выпрацоўкі пытанняў тэорыі літаратуры, асэнсавання культурнага жыцця мінулых стагоддзяў, а таксама строгага аналізу тых з'яваў, што зараджаліся ў маладой беларускай літаратуры. Пры гэтым дасягненні замежнай крытычнай думкі не заўсёды маглі дастасоўвацца да спецыфікі літаратурнага працэсу ў Беларусі. Вось чаму для гісторыі нашай літаратуры падаецца такім значным з'яўленне ўласнай беларускай крытыкі, ля вытокаў якой і стаяў Максім Багадновіч.

Даследнік Мушынскі звязвае літаратурна – крытычную дзейнасць М. Багдановіча з традыцыямі культурна – гістарычнай школы. Сапраўды, пэўная сувязь тут існуе (аналіз літаратуры ва ўзаемасувязі з гісторыяй, увага да нацыянальнай спецыфікі літаратуры і інш.). Але ці варта на падставе гэтага зводзіць крытычную працу М. Багдановіча да гэтага кірунку і тым самым тлумачыць некаторыя спрэчныя моманты ў творчасці крытыка? На нашую думку, тут нельга гаварыць пра нейкае наследванне. Больш правільным будзе адзначыць толькі пэўныя паралелі ў крытычнай дзейнасці М. Багдановіча і прадстаўнікоў культурна – гістарычнае школы.



РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

М. Багдановіч на пачатку XX ст. выказаў многія слушныя думкі, якія змацаваліся ў літаратурнай крытыцы і да апошняга часу. Найбольш каштоўныя з іх – тыя, што датычаць спецыфікі развіцця новае беларускае літаратуры, якая палягае ў яе паскоранасці: “За восем – дзевяць год свайго праўдзівага існавання наша паэзія прайшла усе шляхі..., каторыя паэзія еўрапейская пратаптывала болей ста год”[1]. Характэрнай яе рысай было і тое, што у паэзіі беларусаў, на думку крытыка, было занадта мала беларускага. Сцвярджэнне Багдановіча пра тое, што “беларускіх вершаў у нас яшчэ не было – былі толькі вершы, пісаныя беларускай мовай”[2], даследчыкамі расцэньваліся як перабольшана – катэгарычныя. Тым не менш, на такую думку М. Багдановіч меў права, бо для яго беларускасць была не проста фармальным атрыбутам, а пэўным душэўным станам. Выдатнае адчуванне таго, што напісаць верш па-беларуску – не значыць зрабіць яго беларускім па складзе, падштурхнула М. Багдановіча выкласці сваё разуменне узаемасувязі паміж мастацтвам і вуснай народнай творчасцю. Паводле крытыка, творасць суцэльнага перайманія не ёсць творчасць, бо яна не здольная па тое, каб выкласці сваё разуменне жыцця. Таму існі па шляху сляпога запазычання з вуснай народнай паэзіі не падаецца дапушчальным. Стварыць твор беларускі – значыць зрабіць яго такім і па складзе, і па духу. Толькі ў такім выпадку беларуская літаратура будзе здольная да таго, каб унесці сваё, адметнае, у сусветны літаратурны працэс тым самым адкрыць сябе не толькі для гісторыі сусвету, але і для нашчадкаў сучасных беларусаў.

Вы, літары, цяпер нанова усё збудзілі!
І людзі зведаюць аб прадзедах сваіх,
Аб горы, радасцях і аб прыгодах іх,
Каму маліліся, чаго яны шукалі,
Дзе на глыбокім дне іх крыюць мора хвалі.[3]

Пры гэтым М. Багдановіч зусім не адмаўляе і здабыткаў іншых культур. Але суцэльнае запазычанне чужога, няхай геніяльнага, – гэта прызнанне ў сабе жабрака, які можа толькі браць. Нежаданне бачыць у беларусах гэтае жабрацтва прыводзіць М. Багдановіча да неаспрэчнай думкі пра тое, што сапраўдная літаратура – ёсць сінтэз нацыянальнага і агульначалавечага, прычым агульначалавечае знаходзіць свой адбітак у нацыянальным, і наадварот.

Аналізуючы здабыткі сапраўды беларускай літаратуры, дзіўна толькі тое, што М. Багдановіч да уласнабеларускай творчасці не адносіць дзейнасці Ф. Багушэвіча.

Нас цікавяць найбольш тыя літаратурна-крытычныя артыкулы М. Багдановіча, якія прысвячаюцца агляду гісторыі беларускай літаратуры – “І. Неслухоўскі”, “Глыбы і слаі”, “кароткая гісторыя беларускай пісьменнасці да 16 сталецця”, “За сто гадоў”, “Новы перыяд гісторыі беларускай літаратуры”, “За тры гады”, “Беларускае адраджэнне”. Крытык будуе гэтыя артыкулы на аснове устанаўлення прычынна-выніковых сувязяў паміж з'явамі гістарычнымі і літаратурнымі. Тут мы маем права правесці паралель з культурна-гістарычнай школай. Для дадзеных навукова-крытычных прац харак-

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

тэрны лаканізм, вялікая інфармацыйная насычанасць, шырокі ахоп матэр'ялаў.

Асаблівасцю крытычных прац, якія прысвечаны сучаснаму Багдановічу літаратурнаму працэсу, з'яўляецца тое, што іх аналізуе не чалавек староннi, а паэт, які з'яўляецца яго непасрэдным удзельнікам. Магчыма, гэта і дазволіла яму збольшага беспамылкова даць аналіз творчасці многім паэтам і пісьменнікам. Праўда, гэта не засцерагло яго ад таго, каб пазнейшая крытыка ацаніла яго некаторыя меркаванні як памылковыя. Так, прыкладам, было з Купалам, калі Багдановіч сказаў пра расцягнутасць, недасканаласць формы, аднастайнасць зместу ранняй творчасці паэта. Прычынай гэтага з'яўляецца тое, што Багдановіч-паэт быў вельмі ўважлівы да гэтых катэгорыяў, сцвярджаючы:

Трэба з сталі каваць, гартаваць гібкі верш,
Абрабіць яго трэба з цярпеннем.
Як ударыш ты ім, – ён, як звон, зазвініць,
Брызнуць іскры з халодных каменняў.[4]

Мушынскі ж такі аналіз Купалавай паэзіі растлумачыў тым, што крытык пайшоў ўслед за культурна-гістарычнай школай недаацаніў рамантычнае светаўспрыманне паэта. На нашую думку, гэта не зусім слушна, бо зборнік "Шляхам жыцця", у якім найбольш выявілася тэндэнцыя да рамантычнага светабачання, ацэнены крытыкам даволі высока. Больш правільным будзе прызнаць тое, што ранняя творчасць Купалы была ахарактэрызаваная правільна, але не да канца, бо ўжо ў "Жалейцы" Купала выявіў сябе не толькі як паэт-грамадзянін, але і як паэт-рамантык, што не было заўважана крытыкам.

Такім чынам, М. Багдановіч быў адным з першых, хто заклаў падмурак нацыянальнага літаратуразнаўства. У сваёй навукова-крытычнай дзейнасці ён ішоў ад самых вытокаў літаратуры, асэнсоўваючы прычыны і асаблівасці іх узнікнення, да паказу яе самабытнага станаўлення і росквіту. Гэтым самым ён здолеў паказаць лёс нацыі, яе гісторыю і культуру, сцвердзіць ідэю нацыянальнага адраджэння. Адметна, што, асэнсоўваючы літаратурны працэс, М. Багдановіч найбольш поўна выявіў сябе як крытык-інтэлектуал, крытык-гісторык, крытык-тэарэтык літаратуры.

Літаратура:

1. Багдановіч М. Збор тв.: У 3 т. Т. 2. – Мн., 1993. – С. 287
2. Тамсама. С. 288
3. Багдановіч М. Збор тв.: У 3 т. Т. 1. – Мн., 1992. – С. 87
4. Тамсама. С. 87

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ